Мальчишки, даже, с малолетства
На фронт со взрослыми идут.

Потом бомбёжки, стоны, слёзы,
Потеря близких и родных,
Умерших, тысячу тифозных,
Убогих, нищих и больных...

И я, в глаза бабули глядя,
И замечая в них слезу,
Быть, может, всё не понимая,
Я проклинаю ту войну!

Чтоб наше детство продолжалось,
Чтоб могли учиться я и ты,
Чтоб жизнь хорошей состоялась
О, Боже, ТОЛЬКО Б НЕ БЫЛО ВОЙНЫ!!!

Список используемых источников

1. Великая Отечественная война Советского Народа (в контексте Второй Мировой войны) / под ред. А.А Ковалени, Н. С. Сташкевича. – Минск : Издательский центр БГУ, 2004. – с. 450.
2. Юрась Свірка «Ярданасць». - Минск, 1983. с.126.

## ВЕТРЫНШЧЫНА Ў ГАДЫ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ

Студэнтка групы 1Фк-10
Целепень Г.Ф.
Навуковы кіраўнік
Старшы выкладчык Лебедзева С.В.

Ветрына - гэта адзін з населеных пунктаў Полацкага раёна.

Некалі і Ветрына было таксама раённым цэнтрам з буйной гаспадаркай і мноствам жыхароў. Але прайшоў час, буйнасць змянілася на кволасць, а многія жыхары пераехалі ў Полацк. Зараз гэта просты невялічкі пасёлак гарадскога тыпу, які нічым не адрозніваецца ад мноства такіх жа пасёлкаў па ўсёй нашай роднай Беларусі.

Мэта працы - даследаваць становішча Ветрына і Ветрынскага раёна ў час нямецка-фашысцкай акупацыі, якая пачалася 3 ліпеня 1941 года і скончылася 29 чэрвеня 1944 года.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца час акупацыі і мужная барацьба народа супраць захопнікаў. Прадмет вывучэння – Ветрына.

Многа звестак аб становішчы акупіраванага Ветрына і барацьбе супраць захопнікаў знаходзіцца ў архіве Ветрынскага школьнага музея Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя крыніцы нясуць у сабе інфармацыю аб часе акупацыі. Гэта, па-першае, успаміны ветэранаў, па-другое, дакументы з розных архіваў, якія сабраны ў адзіны архіў музея Вялікай Айчыннай вайны Ветрынскай школы, і, па-трэцяе, дзённік самой брыгады імя Варашылава. Каштоўныя звесткі падаюцца ў кнігах В.Р. Карасёва "Мая любоў – Ветрына" і "Ветрына і наваколле: храналогія гісторыі". Звесткі аб становішчы Ветрына ў час акупацыі ёсць і ў гісторыка-дакументальнай хронікі Полацкага раёна "Памяць". Аб партызанскай барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў дасканала апісана ў дзвюх мемуарных кнігах Дз. В. Цябута, а менавіта: "Путь к победе" і "Сквозь огонь". Ёсць звесткі і ў інтэрнэце, але яны нешматлікія і нясуць у сабе толькі ўрыўкі фактаў. На падставе гэтага матэрыялу і зроблена спроба прааналізаваць і асвятліць становішча Ветрыншчыны ў час нямецка-фашысцкай акупацыі.

Для жыхароў Ветрына, як і для ўсіх, вайна была нечаканасцю. Трэба адзначыць і тыя абставіны, што ў ваенным гарадку на той час не было гарнізона, які напярэдадні адбыў на лагерныя зборы ў Ліду. З вайскоўцаў засталіся толькі вартавыя гарнізоны, якія павінны былі ахоўваць ваенныя склады.

Сустракалі захопнікаў на падыходах да Ветрына і асобныя рухомыя групы 174 стралковай дывізіі. Яе сфарміравалі за год да пачатку вайны, і належыла яна да ліку лепшых злучэнняў уральскай ваеннай акругі. Але галоўныя баі разгарнуліся ля станцыі Фарынава, дзе праходзіла асноўная лінія абароны горада Полацка да 16 ліпеня 1941 года.

Акупацыя Ветрына пачалася 3 ліпеня, а ўся тэрыторыя былога Ветрынскага раёна - толькі з 16 ліпеня 1941 года. Калі заняць Ветрына акупантам удалося амаль без супраціўлення, то накірунак на Полацк быў для захопнікаў вельмі складаным.

Лінія абароны Полацка праходзіла па правым беразе ракі Ушача. Змагаліся тут 174-я дывізія Зыгіна і іншыя падраздзяленні, што паступілі ў падпарадкаванне Зыгіну. Абарона працягвалася да змяркання 15 ліпеня.

Тэрыторыя Ветрына ўвайшла ў зону армейскага тылу групы армій "Цэнтр". Устанаўленнем "новага парадку" займаліся непасрэдна войскі СС - ахоўныя атрады, СА - штурмавыя атрады, паліцыя бяспекі, СД - служба бяспекі, ГПФ - таемная палявая паліцыя, паліцыя падтрымання парадку, гестапа і іншыя спецыяльныя падраздзяленні. У Ветрыне размясціліся нямецкія службы і невялікі гарнізон, была створана Ветрынская сельская ўправа.

Усе жыхары павінны былі прайсці рэгістрацыю з адзнакай у пашпарце і нумарам зарэгістраванага. Усталяваліся нормы здачы збожжа, бульбы і агародніны, сена, канюшыны і саломы. Прадугледжвалася снегаачыстка дарог і вуліц. Ветрынская сельская ўправа спланавала веснавую сяўбу на 1942 год. Устанавілі вельмі жорсткі парадак карыстання паштовым пунктам, які быў створаны і ў Ветрыне. Карыстацца гэтым пунктам маглі толькі бурмістры, аграномы і загадчыкі гаспадарак. Прыём і перасылка ад прыватных асоб строга забаранялася.

У першую чаргу акупанты збіралі звесткі, выяўлялі камуністаў і савецкіх актывістаў, праследавалі і растрэльвалі іх.

У Ветрыне быў спецлагер для затрыманых. Такія лагеры былі ў вёсках Лесава, Будзькаўшчыне і на тэрыторыі сучаснага саўгаса "Банонь". У гэтых чатырох лагерах знаходзіліся ваеннапалонныя і грамадзянскае насельніцтва. Масавыя забойствы ў іх пачаліся ўжо з ліпеня 1941 года і працягваліся да чэрвеня 1944 года. Месцы для ўтрымання былі абнесены агароджай у некалькі радоў з калючага дроту. Людзей марылі голадам, прымушалі выконваць непасільную працу. Тых, хто выбіваўся з сіл, расстрэльвалі на месцы або забівалі палкамі. Гітлераўцы стваралі ўмовы для распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў, у прыватнасці сыпнога тыфу. Нярэдка катаванні і расстрэлы з'яўляліся прадметам забаў лагернага начальства. За гэты перыяд у лагерах памерла ад голаду і хвароб больш за 600 чалавек.

У Ветрыне размяшчаўся створаны акупантамі паліцэйскі полк, у склад якога ўваходзілі тры батальёны, шэсць рот і штаб батальёна. Пры штабе - сапёрны ўзвод і ўзвод сувязі. Немцы ўкамплектавалі іх у асноўным за кошт мясцовых здраднікаў, людзей, незадаволеных савецкай уладай, былых злачынцаў і арыштантаў. Асабліва актыўная падрыхтоўка сіл гэтай варты вялася з пачатку 1944 года, калі акупанты адчулі набліжэнне адплаты.

Кожны паліцай даваў клятву Германіі. Вось яе тэкст ад 3 студзеня 1943 года з подпісам прыняўшага: "Як сапраўдны сын сваёй Радзімы я добраахвотна ўступаю ў рады ОД і ўрачыста клянуся, што я сапраўды буду змагацца супраць бальшавізму… <…> …свята абяцаю Адольфу Гітлеру… <…> …быць сапраўдным і дысцыплінаваным байцом. Выконваючы гэтую клятву, я гатовы не шкадаваць свайго жыцця".

Паліцаі актыўна ўдзельнічалі ў расправе над мірнымі жыхарамі, у спальванні вёсак і дамоў савецкіх актывістаў, партызан і чырвонаармейцаў. Так дзесьці ў канцы 1943 года амаль уся вёска Наўліцы была спалена. Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Услед за вайскамі вермахта прыбылі эрзацкаманды і іншыя органы, у абавязкі якіх уваходзіла "вырашэнне яўрэйскага пытання". Фашысты правялі перапіс яўрэйскага насельніцтва, канфіскавалі маёмасць, пад прымусам выганялі на працу. У 1941 годзе ў Ветрыне было расстраляна 59 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці, што жылі ў Ветрыне, сярод якіх 14 дзяцей ва ўзросце ад 1 да 14 гадоў.

Вакол Ветрына фашысты размясцілі тры назіральныя вышкі, дзе паліцаі таксама неслі службу. Адна ля возера Ветрынскага, дзе размяшчалася даваенная пажарная часць, другая на гары супраць сучаснай паліклінікі, выселіўшы жыхароў, што там жылі. Зрабілі там акопы і ўмацаванні. Трэцяя - на былой сядзібе арандатара Драздовіча ля возера.

Асвятленне цэнтра Ветрына ажыццяўлялася ад лакамабіля, што размяшчаўся ля будынка сучаснай лазні. Электралінія была і ў вёсцы Шайтары, дзе жылі немцы.

Нямецкі шпіталь размяшчаўся ў вёсцы Пашуціна. За яйкі, сала нямецкі ўрач выязджаў лячыць мясцовых жыхароў.

За час акупацыі ў Ветрынскім раёне асабліва пацярпелі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Тураўлянскі, Семянецкі, Заскорскі, Наўліцкі, Вароніцкі, Гарадоцкі і Бабыніцкі сельсаветы, гэта ў асноўным тыя раёны, дзе была партызанская зона. У іх усе калгасныя пабудовы і дамы калгаснікаў былі спалены, жывёла сагнана ў Германію, асабістая маёмасць калгаснікаў была разрабавана.

Да 1943 года акупанты займаліся вярбоўкай рабочай сілы ў Германію. Вось, напрыклад, аб'ява гаспадарчай інспекцыі ад 15 студзеня 1942 года ў вёсцы Шпакоўшчына: "Вялікая Германія дасць рускаму і беларускаму насельніцтву ... ва ўзросце ад 17 да 40 гадоў працу і хлеб. За працу ў Нямеччыне даюцца: прадукты, кватэра і зарплата ў дастатковым памеры ... за адмыслова добрае выкананне працы - дадатак у выглядзе тытуню, напояў і г. д... Наглядчык Вейгант. Генерал-лейтэнант". Такі заклік не знайшоў падтрымкі, і з 1943 года адпраўка рабочай сілы ў Германію праводзілася ўжо гвалтоўна.

Нямецка-фашысцкая акупацыя для Ветрыншчыны была сапраўдным выпрабаваннем на мужнасць і любоў да сваёй радзімы. Гэта выпрабаванне яшчэ раз даказала, што беларускі народ не так проста звесці са свету альбо заняволіць.

З першых дзён акупацыі патрыёты не зміріліся з парадкам новых гаспадароў. Як і па ўсёй краіне, стыхійна пачалася барацьба з акупантамі. Ініцыятарамі былі пакінутыя тут актывісты і мясцовыя камсамольцы. Ветрынскі падпольны райкам быў створаны ў верасні 1942 года, асноўная база якога знаходзілася ў партызанскім атрадзе "Мсцівец", а са снежня 1942 года ў брыгадзе імя Варашылава. Члены бюро Ветрынскага РК камсамола ў снежні 1941 года ў Ветрыне стварылі тры падпольныя камсамольскія арганізацыі, якія распаўсюджвалі зводкі савецкага інфармбюро, арганізавалі збор зброі і боепрыпасаў.

Нацыянальны архіў Беларусі пацвярджае той факт, што ў гады акупацыі ў Ветрыне дзейнічала падпольная камсамольская група. У справаздачы аб дзейнасці камсамольскай арганізацыі атрада "За Радзіму" брыгады імя Варашылава з 10 лютага па 10 сакавіка 1943 года ўказана, што ў Ветрынскім раёне дзве падпольныя групы, у калгасе "Чэкіст" і пасёлку Ветрына. Іх задача - дастаўляць лістоўкі і зводкі інфармбюро ў нямецкі гарнізон.

У жніўні 1942 года прадстаўніком Віцебскага абкама таварышам Зуевым у Ветрынскім раёне быў створаны раённы камітэт камсамола. У арганізацыі налічвалася 18 камсамольцаў.

Мужная барацьба ветрынскіх падпольшчыкаў з лютым ворагам наносіла яму значныя страты і набліжала доўгачаканы час вызвалення роднай зямлі. Іх інфармацыя, якую яны перадавалі партызанам, і падрыўная дзейнасць у тылу ворага - гэта хоць і маленькая, але ўсё ж кропля ў вялікай плыні вады, якая растачыла камень фашызму.

Як вядома, пачатак партызанскай дзейнасці на Ветрыншчыне звязаны з высадкай у ноч з 14 на 15 ліпеня 1942 года 46 чалавек на чале з Дз. В. Цябутам

у тыл ворага з мэтай арганізацыі партызанскіх атрадаў і барацьбы з акупантамі. Гэта быў першы атрад "Мсцівец", які пачаў дзейнічаць 15 ліпеня. Другая састаўная частка будучай брыгады імя Варашылава - гэта група байцоў Чырвонай арміі, якая ўцякла з варожага палону ў снежні 1941 года.

Але брыгада не магла ўзнікнуць на роўным месцы. Яе стварэнню паспрыялі наступныя фактары: тэрор, рабаванне насельніцтва, наяўнасць у раёне людскога кантынгенту, наяўнасць зброі і боепрыпасаў.

Першапачаткова месцам базіравання быў раён, абмежаваны вёскамі Валокі, Бікульнічы, Горкі, Гомель, Саламір´е, Гарнаполле, Пашкі, што цалкам забяспечыла стварэнне харчовай базы. Сам атрад дыслакаваўся ў цэнтры пералічаных вёсак, сяліба Рапішча. Пасля праверкі суседскага раёна была усталявана наяўнасць яшчэ адной групы, дзе былі кадры з былых вайскоўцаў і ваеннаабавязаных. Таму было прынята рашэнне аб фарміраванні новага атрада з месцам дыслакацыі паміж Полацкам і вёскай Зуі. 22 верасня адбылася сустрэча з Дз. В. Цябутам, і 24 верасня на базе гэтай групы ўзнік новы атрад "Смерць фашызму".

Засваенне гэтага раёна дало магчымасць для росту атрада "Смерць фашызму", дыслакаванага ў гэтым раёне, і для іншых атрадаў. Да студзеня 1943 года два атрады "Мсцівец" і "Смерць фашызму" мелі ў сваім складзе 200 чалавек. У гэты час быў сфарміраваны новы атрад "За Радзіму".

Атрад "Смерць фашызму" выконваў агульную задачу па разгроме валасцяў, дробных паліцыянтаў, гарнізонаў і адначасова актывізаваўся на лініі камунікацый. Адважна дзейнічалі падрыўнікі гэтага атрада: у сярэдзіне кастрычніка група скінула пад адхон воінскі эшалон, які рухаўся на фронт. Пры крушэнні было пабіта 2 паравоза і 28 вагонаў, 10 вагонаў з танкістамі і лётчыкамі і 18 – з артылерыяй і транспартам. У завяршэнні ў вёсцы Падкасцелле падрыўнікі спалілі мост. Пасля стварэння атрада "Смерць фашызму" паўночная частка раёна апынулася пад кантролем партызан. Аднак у заходняй частцы, у зоне мястэчка Бабынічы, усё яшчэ знаходзіліся акупанты. У гэты час у Бабынічах ужо дзейнічала падпольная група. З першымі пастаўленымі задачамі - руйнаваць дарогі і масты - група выдатна справілася. І у пачатку верасня 1942 года, калі тэрыторыя Бабыніч была вызвалена ад немцаў, было прынята рашэнне аб стварэнні трэцяга атрада "За Радзіму".

Пасля стварэння атрада "За Радзіму" ў студзені 1943 года бюро падпольнага райкама партыі прыняла рашэнне аб стварэнні на тэрыторыі Ветрынскага раёна партызанскай брыгады імя Варашылава.

Дзякуючы ўзмацненню партыйнага ўплыву і папулярнасці партызан сярод насельніцтва, у партызанскія атрады сталі ўступаць цэлымі сем'ямі і вёскамі. У сакавіку 1943 года быў створаны камсамольска-маладзёжны атрад "КІМ", у ліпені – атрад "Бальшавік", і нарэшце, у жніўні быў арганізаваны атрад ім. Гастэлы.

Такім чынам, канчаткова брыгада імя Варашылава сфарміравалася да канца жніўня 1943 года і налічвала ў сваім складзе 6 партызанскіх атрадаў:

"Мсцівец", "Смерць фашызму", "За Радзіму", "КІМ", брыгада ім. Гастэлы і "Бальшавік". Колькасць партызан складала 1300 чалавек.

Баявая дзейнасць брыгады пачалася з першых дзён прыходу групы Цябута з-за лініі фронту. Першы перыяд, з ліпеня да снежня 1944 года, характарызуецца дзеяннем невялікіх груп па разгроме валасных управ, паліцаяў, участкаў нямецкіх гаспадарак і дзеяннямі дыверсійных груп на чыгуначных дарогах. Перыяд са снежня 1942 г. па 1944 г. характарызуецца разгортваннем дыверсійнай працы на чыгунках у больш шырокіх маштабах і актывізацыяй партызанскіх дзеянняў супраць асобных нямецкіх гарнізонаў. Апошні перыяд да моманту злучэння з Чырвонай арміяй брыгада не займала ўчастак абароны, а перайшла да дзеянняў асобнымі групамі на магістралях праціўніка і спыненні карных мерапрыемстваў, у якіх прымаў удзел знакаміты латышскі легіён “Waffen SS”.

За час сваёй барацьбы супраць акупантаў брыгада імя Варашылава паказала сапраўдную мужнасць і любоў да сваёй краіны. Яна была адной з многіх партызанскіх брыгад, што існавалі на тэрыторыі Беларусі і не давалі спакою ворагу.

Раніца 29 чэрвеня 1944 года стала вельмі важнай у жыцці ветрынцаў. Менавіта гэта дата адзначаецца ў храналогіі як дзень вызвалення Ветрына. Вёска Ветрына і Ветрыншчына былі вызвалены ў ходзе Полацкай аперацыі войскамі першага Прыбалтыйскага фронту, а больш дакладна - падраздзяленнямі Першага танкавага корпуса генерала У. У. Буткова.

Баі непасрэдна за вёску Ветрына, а больш дакладна за станцыю Ветрына, вялі воіны 89-й танкавай і 44-й матастралковай дывізіі пры падтрымцы авіяцыі, а таксама - 45 гвардзейскага танкавага палка. Наступленне вялі з боку в. Наўліцы сіламі 89-й танкавай брыгады і 45-га гвардзейскага танкавага палка і з боку Заскарак сіламі 44-й матастралковай брыгады. Страты за 29.06.1944 года.: забіты - 18; паранены - 54; выйшла са строю машын - 8; гармат - 4; куляметаў - 3; кухняў - 2; трафеяў: узята гармат - 6; вінтовак - 16; пісталетаў - 5; складоў з харчаваннем - 2; палонных салдат і афіцэраў - 27; знішчана да 180 салдат і афіцэраў праціўніка.

Вайна - гэта жах. Ветрына за час Вялікай Айчыннай вайны перанесла ўсе жахі, якія прыгатавалі нашаму народу акупанты. Але, нягледзячы на гэта, наш народ, у тым ліку жыхары Ветрына і яго наваколля, не зламіўся, а наадварот, з мужнасцю і самааддачай роднаму краю кінуўся ў вадаварот абароны сваіх родных мясцін. Мужная абарона Ветрына, нягледзячы на тое, што яна цягнулася ўсяго адзін дзень, паказала, што ворагу так проста не атрымаць нашай зямлі. Нават той факт, што ў Ветрыне не было гарнізона, паказаў, што адна рота аховы можа стрымаць добра падрыхтаванага і ўзброенага ворага. Вораг лютаваў на Ветрынскай зямлі. У Ветрынскім раёне немцы знішчылі 93 населеныя пункты, 2711 дамоў калгаснікаў. Чалавечыя ахвяры налічваюць 1090 чалавек, сярод іх 513 – жанчыны і 85 – дзеці! Насельніцтва Ветрынскага раёна зменшылася з 34 564 чалавек да 18 941 чалавека! Усяго за час акупацыі з Ветрынскага раёна ў Нямеччыну было вывезена 500 мужчын і 624 жанчыны.Але ветрынцы не сталі на калені і не пачалі прасіць ад новай улады літасці. Яны пачалі падпольную

барацьбу супраць захопнікаў. Не мірыліся з ворагам таксама партызаны і падпольшчыкі.

Беларусь аказалася ў эпіцэнтры трагічных падзей Вялікай Айчыннай вайны. Яе народ перажыў цяжкія выпрабаванні, якія абумовіла акупацыя і барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Трагічныя падзеі рабілі жыхароў Беларусі толькі больш мужнымі і прагнымі да жыцця. Дзякуючы гэтаму, наша пакаленне жыве на мірнай і квітнеючай беларускай зямлі. Старонкі мінуўшчыны павінны абуджаць у нас гонар за сваю Радзіму, імкненне ўнесці пасільны ўклад у яе росквіт, каб у сваю чаргу выклікаць добрую памяць будучых пакаленняў. Страты, якія Беларусь панесла ў час Вялікай Айчыннай вайны, павінны стаць урокамі на будучае, добрай нагодай для роздуму аб тым, як пазбегнуць памылак і пралікаў у будучым.

## РОЛЬ ВНЕШНЕПОЛИТИЧЕСКИХ ВЕДОМСТВ (ДИПЛОМАТОВ) В ПОДГОТОВКЕ К ПРОВЕДЕНИЮ НЮРНБЕРГСКОГО ПРОЦЕССА

студентка группы 2КД-12
Якубкина Я.Р.
научный руководитель
старший преподаватель Остапишина Л.О.

*Я здесь, чтобы жить…*
*Я живу, чтобы быть…*
*Я есть, потому что это Я…*

Есть люди, которые одним своим наличием, одним своим присутствием способны вершить историю, переворачивать и менять ходы подобно игре в шахматы. И люди эти, несомненно, гордо носят свое звание, яростно отстаивают интересы своей страны. Они - дипломаты. И мне хотелось бы проследить, какова же была их роль на Нюрнбергском процессе, на процессе, который изменил жизнь тысячам, нет…, миллионам людей. На самом процессе роль дипломатии весьма узка: 4 судей – сторона обвинения – сторона защиты (подсудимые и адвокаты) – иные участники (свидетели, переводчики, специалисты). Однако дипломатия внесла огромную роль в подготовке процесса, а сам процесс – это лишь процесс (прошу прощения за тавтологию). Качественная подготовка позволила провести процесс в кратчайшие сроки, около 1 года, для сравнения, современные трибуналы (к примеру, по Руанде, бывшей Югославии) длились от 3 до 5 лет, а это, помимо нравственной стороны, еще и колоссальные средства.

В отечественной науке концептуальные основы международного уголовного права были заложены выдающимся дипломатом - профессором Ф.Ф. Мар-